# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 5 ліпень 2012



Галасуй – не галасуй... – с.2

Запавет Кастуся Каліноўскага – с.3

Дыктатуры ў Еўрасаюз не бяруць – с.4-6

Свінцовы завод і лецішчы – с.7


# Выбары як нагода

**З чым і як ідзе на парламенцкія выбары, што адбудуцца 23 верасня, Рух "За Свабоду"?**

"За Свабоду" – грамадская арганізацыя, а не палітычная партыя, а таму не мае права вылучаць сваіх кандыдатаў на выбарах. Разам з тым Рух будзе браць удзел у іх наступным фарматам.

Кампанія разглядаецца арганізацыяй у першую чаргу як магчымасць легальных камунікацый з насельніцтвам, чаго апазіцыйныя сілы пазбаўленыя ў міжвыбарны перыяд. Гаворка вядзецца пра доступ да дзяржаўных агульнарэспубліканскіх і лакальных СМІ, і наўпроставыя сустрэчы з выбаршчыкамі.

Паколькі Рух "За Свабоду" не можа вылучаць кандыдатаў у дэпутаты, то падтрымае тых, хто мае блізкія пазіцыі: падзяляе каштоўнасці незалежнасці, дэмакратыі, нацыянальнага адраджэння і выбар еўрапейскага шляху развіцця краіны. Гэта могуць быць як вылучэнцы ад партнёрскіх партый, так і незалежныя кандыдаты.

**Працяг на с. 2**






# Год беларускага Чэ Гевары

**У Беларусі абвешчана маштабная кампанія па папулярызацыі герояў паўстання 1863-1864 гадоў – Год Каліноўскага. Створаны адмысловы аргкамітэт з некалькіх дзясяткаў грамадскіх і культурніцкіх дзеячаў, які ачолілі вядомы гісторык і публіцыст Янка Запруднік, а таксама лідары Руху "За Свабоду" і кампаніі "Гавары праўду!" Аляксандр Мілінкевіч і Уладзімір Някляеў.**

**Працяг на с. 3**

# Галасуй – не галасуй...

**Удзельнічаць у вераснёўскіх парламенцкіх выбарах гатовыя 50,7% апытаных НІСЭПД у чэрвені беларусаў. 19,4% нашых грамадзян не збіраюцца браць удзел у галасаванні, а 29,9% яшчэ не вырашылі.**

Станоўча да байкоту гэтых выбараў ставяцца 14,2%, адмоўна 29,5%, абыякава 28%, а 28,3% нічога пра гэта не чулі.

Колькасць людзей, якія аддаюць перавагу галасаваць за альтэрнатыўных кандыдатаў, прыкметна ўзрасла за час, які прайшоў з мінулых выбараў у парламент. Калі чатыры гады таму за прыхільнікаў Аляксандра Лукашэнкі збіраліся галасаваць 39,6%, за праціўнікаў 17,7%, а за іншых кандыдатаў 31,4%, то сёння адпаведна 27,6%, 28,2% і 27,4%.

Разам з тым, стаўленне беларусаў да парламенцкіх выбараў як да шляху, які вядзе да пераменаў, прыкметна трансфармуецца, адзначаюць сацыёлагі. Так, толькі 36,8%



апытаных думаюць, што гэтыя выбары будуць свабоднымі і справядлівымі, а 39,6% прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання, толькі 36,7% лічаць, што вынікі выбараў залежаць ад іх галасоў, а 54,5% прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання. Толькі 39,1% лічаць, што на гэтых выбарах будзе адбывацца рэальная барацьба, 46,9% – што будзе толькі імітацыя барацьбы, а размеркаванне месцаў загадзя вызначана ўладамі, толькі 38,5% лічаць, што Палата прадстаўнікоў, якую абяруць на маючых адбыцца выбарах, будзе адлюстроўваць інтарэсы грамадства, а 46,2% прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання. 40,3% наогул лічаць, што дзейнасць Палаты прадстаўнікоў не ўплывае на іх жыццё і жыццё іх блізкіх ("уплывае" сказалі 44,5%).

Сацыёлагі НІСЭПД адзначаюць, што такое скептычнае стаўленне да парламенцкіх выбараў з'яўляецца вынікам не толькі палітыкі ўладаў. Напрыклад, толькі 37,7% лічаць, што ў кандыдатаў ад апазіцыі будуць рэальныя праграмы па паляпшэнні жыцця ў краіне, а 40,1% з гэтым не згодныя (у кандыдатаў, якія падтрымліваюць уладу, ёсць такія праграмы, на думку 45,8%, а няма – 37,8%). У гэтых умовах выбаршчыкі асабліва цікавяцца незалежным назіраннем на выбарах. Большасць з іх (63,7%) лічаць, што незалежнае назіранне за ходам выбараў садзейнічае большай сумленнасці і аб'ектыўнасці выбараў, 52,7% зацікаўлены атрымліваць інфармацыю аб захаванні выбарчых працэдур ад назіральнікаў (аддаючы перавагу незалежным назіральнікам – 37,7%, а не назіральнікам арганізацый, якія падтрымліваюцца ўладамі, – 6,9%).

# Выбары як нагода (працяг)

Пачатак на с.1

Што тычыцца зместу перадвыбарчых інфармацыйна-агітацыйных пасланняў, то аснову іх складуць тэзы "Народнай праграмы", якая ўяўляе сабой канцэпцыю рэформаў у самых розных сферах (ад жыллёва-камунальнай гаспадаркі да палітычнай сістэмы).

Рух "За Свабоду" ставіць на мэце прадставіць грамадству пазітыўную альтэрнатыву.

Што тычыцца зняцця кандыдатаў напярэдадні галасавання, то права прымаць рашэнне на гэты конт Рух пакідае за кандыдатамі, якіх ён падтрымае.прача гэтага, актывісты Руху паспрабуюць патрапіць у склад выбарчых камісій і ў назіральнікі.

Дарэчы, падчас нядаўняга ўнутранага аўдыту сябраў Руху папрасілі адказаць на пытанне пра тое, якім чынам мусіць дзейнічаць арганізацыя на парламенцкіх выбарах увосень. Вылучаць назіральнікаў – адказ 26,3%, вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі – 23,6%, вылучаць кандыдатаў – 15,6%, байкатаваць выбары – 16%, прасоўваць "Народную праграму" – 13,5%, займацца грамадскай дзейнасцю, не звязанай з выбарамі, – 5,9%.

З іншых статыстычных вынікаў: 28,3% рухаўцаў лічаць, што арганізацыя развіваецца ў слушным кірунку, а 55,1% – хутчэй у слушным, чымсьці няслушным. 66,9% падзяляюць еўрапейскі накірунак дзейнасці Руху, 32,3% – хутчэй падзяляюць. 9,4% актывістаў-рэспандэнтаў лічаць, што Рух з'яўляецца палітычнай арганізацыяй, 52,8% – хутчэй палітычнай, чым грамадскай, 13,4% – грамадскай, 24,4% – хутчэй грамадскай, чым палітычнай.

Пасля парламенцкіх выбараў адбудзецца справаздачна-выбарчая канферэнцыя арганізацыі. Дэлегаты на яе будуць вылучацца на абласных, а таксама "куставых" сходах у рэгіёнах. Рада Руху "За Свабоду" выказала імкненне зрабіць канферэнцыю як мага болей прадстаўнічай. Аднак не выключыла, што могуць узнікнуць складанасці з арэндай буйнога памяшкання для канферэнцыі. Нагадаем, актывісты Руху не змаглі адзначыць 20 траўня нават першы малы юбілей арганізацыі – пяцігоддзе. Мерапрыемства было сарванае.

# Год Героя

Пачатак на с. 1

Апрача іх, у складзе аргкамітэта па адзначэнні Года Каліноўскага – Уладзімір Арлоў, Антон Астаповіч, Генадзь Бураўкін, Уладзімір Колас, Аляксей Марачкін, Наста Палажанка, Барыс Пятровіч (Сачанка), Сяргей Харэўскі ды іншыя.

Год Каліноўскага прымеркаваны да надыходзячага 150-годдзя вызвольнага паўстання супраць расейскага царызму. Мерапрыемствы кампаніі пачнуцца ўвосень 2012 года і будуць ладзіцца цягам усяго 2013 года.

Мерапрыемствы запланаваны самыя разнастайныя – ад прыборкі могілак герояў-паўстанцаў да навуковых канферэнцый. Як распавёў выканаўчы сакратар аргкамітэта, намеснік старшыні Руху “За Свабоду” **Юрась Губарэвіч**, сярод іншага будзе створаны дакументальна-публіцыстычны фільм “Кастусь”, прынятыя звароты да выканкамаў з прапановай назваць вуліцы гарадоў імем Кастуся Каліноўскага, кіраўніка паўстання.

Паводле яго словаў, чакаюцца маладзёжныя крэатыўныя акцыі па папулярызацыі постаці Каліноўскага – дзеля пераўтварэння яго асобы ў брэнд Беларусі, у “беларускага Чэ Гевару”.

**Аляксандр Мілінкевіч** адзначыў, што Год Каліноўскага ў першую чаргу разлічаны на моладзь, якая павінна выхоўвацца на славутых і



гераічных постацях. Лідар Руху “За Свабоду” давёў, што гэта вельмі важна, таму што цяпер ў школы вяртаюцца “імперскія” падручнікі: *“Растуць канфармісты… Патрэбна выхаванне на постацях”.*

*“А Каліноўскі – апостал беларускай свабоды і барацьбы за незалежнасць. Герой на ўсе вякі! Гэта прыклад для нас. Такія людзі ствараюць пачуццё годнасці для нацыі. Тое, за што змагаліся паўстанцы 1863-1864 гадоў, актуальна і цяпер. Не стае свабоды, пад пагрозай незалежнасць. Шмат часу прайшло, але для беларусаў працягваецца змаганне за выжыванне нацыі, дзяржавы”*, – заявіў Аляксандр Мілінкевіч.

Разлічвае аргкамітэт, што ініцыятыва па ўшанаванні паўстанцаў Каліноўскага знойдзе станоўчую рэакцыю ва ўладаў. *“Якой б ні была ўлада, мы ўсе беларусы. Нашы суседзі змагаюцца за любую постаць, за якую можна зачапіцца – гераізаваць, зрабіць сімвалам нацыі, падымаць, падымаць, падымаць… Гэта цэментуе нацыю,”* – заўважыў **Уладзімір Някляеў**.

Паводле яго, *“ёсць людзі і ва ўладзе, якія любяць Беларусь і выхаваныя на Каліноўскім”.*

Нагадаем, пароль паўстанцаў: *“– Каго любіш? – Люблю Беларусь! – То ўзаемна!”*

*“Супольныя справы – вось дыялог*, – дадае Мілінкевіч. *– Калі дзяржава дбае, калі для ўладаў перадусім Беларусь, то яна падтрымае нашу ініцыятыву”.*

Аляксандр Мілінкевіч падкрэсліў, што вельмі спадзяецца на лакальныя актыўнасці ў справе адзначэння Года Каліноўскага. Бо шмат мясцін звязаны з гэтай гістарычнай падзеяй. Ён прывёў у якасці прыкладу свае родныя Берšты, якія былі адным цэнтраў паўстання. Побач ёсць балота, якое завецца Святым. На гэтым балоце ёсць выспа, на якой паўстанцы памерлі з голаду, але не трапілі ў рукі царскіх войскаў.

У тым ліку ў такіх вось месцах павінны стаяць крыжы, помныя знакі, вісець мемарыяльныя шыльды. Натуральна, што ў краіне павінны быць помнікі Кастусю Каліноўскаму і паўстанцам.

## “Ліст з-пад шыбеніцы” Кастуся Каліноўскага (урывак)

*“Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і, можа, раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, – но не жаль згінуць за тваю праўду… Няма ш, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і науку… Но як дзень з ноччу не ходзіць разам, так не ідзе разам наука праўдзіва з няволяй маскоўскай. Дапокуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякай наукі, – адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, но на пагібель нашу… Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе”.*

# Аляксандр Мілінкевіч: З дыктатурай у Еўрасаюз не бяруць



**Больш за гадзіну старшыня Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч адказваў на самыя розныя пытанні чытачоў “Народнай Волі”. Часам даходзіла да кур’ёзаў.**

Паколькі было шмат званкоў і тэлефон “прамой лініі” амаль увесь час быў заняты, жыхарка Магілёва патэлефанавала на іншы рэдакцыйны нумар. І папрасіла запытаць у Мілінкевіча, дзе можна... запатэнтаваць вынаходку. На рэмарку журналістаў, што, маўляў, пытанне хутчэй за ўсё не па адрасе, чытачка адказала: “Дык вы ж у анонсе напісалі, што ён адкажа на любыя пытанні!

## Якая карысць ад ценявога ўрада?

**– Гэта Аляксандр Мікалаевіч Мельнікаў непакоіць з Гродна. Вы мне сімпатычны як палітык. Хачу спытаць: што вы думаеце наконт ідэі палкоўніка Барадача стварыць за мяжой ценявы ўрад?**

– Я заўсёды зыходжу з пункту гледжання простых людзей. Ці патрэбна ім, каб апазіцыя за мяжой стварыла ўрад? Ці ў гэтым вырашэнне нашых праблем? Думаю, большасць людзей не зразумее гэтага і асудзіць. Скажуць, што паехалі за доўгім рублём. І я не веру ў магчымасць стварэння за мяжой супольнага ўрада. Але думаю, што нашы эмігранты маглі б шмат зрабіць для Беларусі.

## Санкцыі павінны быць персанальнымі

**– Вам тэлефануе Сяргей Мікалаевіч Новік з Рагачова. Я вось думаю: ці мэтазгодна ўвогуле змагацца з рэжымам Лукашэнкі? Мне здаецца, усім ясна, што гэты рэжым яшчэ гадоў на 20. І, на мой погляд, мы наўрад ці яго пераможам. Я сам з рабочай сям’і і добра ведаю настроі народа, які баіцца і ўлады, і міліцыянтаў, і нават самога сябе! Мне падаецца, трэба прасіць, каб еўрапейцы ўвялі самыя жорсткія санкцыі – можа, толькі тады нешта зменіцца.**

– Магчыма, Лукашэнку і хацелася б кіраваць вечна, але людзі ўжо стаміліся ад створанай ім сістэмы. І я ведаю, што многія чыноўнікі гэта адчуваюць. І не выключана, што ў хуткім часе рэжым можа распачаць сур’ёзныя эканамічныя рэформы і палітычную лібералізацыю. Таму што іншым шляхам захаваць уладу будзе вельмі цяжка.

Што тычыцца жорсткіх санкцый, то яны не выпраўлялі сітуацыю і ў іншых краінах. У выпадку санкцый да Беларусі людзі, наадварот, могуць аб’яднацца вакол дыктатара, а апазіцыю абвінаваціць ва ўсіх праблемах. Я супраць шырокіх санкцый, але выступаю за кропкавыя, персанальныя санкцыі супраць тых, хто парушае закон. І я вам так скажу: трэба быць больш аптымістычным! Час дыктатур скончыўся. Свет мяняецца.

**– Тады яшчэ адно пытанне. Мы баімся, каб Расія нас не з’ела. Спачатку ўтварылі Мытны саюз, а потым можа быць і аб’яднанне. І гэта будзе катастрофа!**

– Тут я з вамі цалкам салідарны, бо Расія мае намер стварыць новы Савецкі Саюз – спачатку на эканамічнай аснове. І мы не будзем гаспадарамі на сваёй зямлі, калі расійскія алігархі выкупяць нашы прадпрыемствы. З Расіяй трэба сябраваць, гандляваць, але жыць павінен кожны ў сваім доме. Да таго ж Расія – краіна з моцным крыміналітэтам, там была бандыцкая прыватызацыя. І калі мы ўсе будзем катэгарычна супраць анексіі эканамічнай, то адстаім сваю краіну. Няма ў нас будучыні без незалежнасці. Перадусім Беларусь!

## Дайце глытнуць вады!

**– Звоню из Минска. Зовут меня Валентина Поликарповна. Вы уже отвечали в “Народной Воле” на вопрос по поводу качества питьевой воды. Хочу напомнить, что мы к вам тоже обращались по поводу Севастопольского парка и скважин. У нас строят дома, рестораны, и при этом уничтожаются скважины! Выходит, мало кого заботит чистота и безопасность воды...**

– Это важная тема, и я в курсе этой проблемы. Однако вы поймите – я такой же гражданин, как и вы. Я, конечно, могу еще раз попытаться поднять эту проблему в СМИ, наше движение может оказать вам юридическую поддержку. Если знаете, чем еще могу помочь, – давайте встречаться, обсуждать.

Были бы у нас в Палате представителей реальные представители народа – можно было бы действовать через депутатов, а так... Нужны честные выборы и реально действующие депутаты. Тогда многие проблемы будет решать проще.

**Працяг на с. 5**

пачатак на с. 4

## Можа, усё-такі імпічмент?

**– Меня, как и вас, зовут Александр. Как вы думаете, реально объявить президенту импичмент?**

– Импичмент может объявить парламент. И во времена Верховного Совета эта процедура была возможной. Правда, в 1996 году из-за того, что некоторые депутаты отозвали свои подписи, он не сработал. Иначе мы с вами сейчас жили бы в совершенно другой Беларуси. А сегодняшний парламент (вы же сами понимаете) на импичмент не решится. Потому что нынешние депутаты – часть государственного аппарата. И пока нет в стране свободных выборов, импичмент нереален.

**– Еще, пользуясь случаем, хотел бы попросить “Народную Волю” напечатать сказку Корнея Чуковского “Тараканище”. Вы даже не представляете, насколько это актуальное произведение!**

– Передам редакции ваше пожелание. Сказки у нас пока доступны, так что каждый может перечитать при случае...

## Раўненне на Захад? Альбо на Расію?

**– Добрый день! Меня вот что интересует: насколько я могу судить, большинство народа – за бойкот, а политики собираются участвовать в парламентских выборах. Люди хотят идти в ногу с Россией, а оппозиция смотрит в сторону Евросоюза. Получается, политики не учитывают мнение народа?**

– Лично я доверяю социологическим исследованиям зарегистрированного в Вильнюсе НИСЭПИ. И, согласно их данным, за бойкот в Беларуси сегодня выступает чуть более 10 процентов.

Кстати, радует, что, согласно соцопросам, за объединение с Россией выступает не так много людей. Белорусы выбирают суверенитет.



Уладзімір Арлоў іАляксандр Мілінкевіч на радзіме Васіля Быкаваў Бычках  (2008 г.)

## Хто спыніць ілжывых міліцыянтаў?

**– Очень часто в последнее время в судах выступают лжесвидетелями милиционеры. Составляете ли вы список этих непорядочных людей?**

– Я за то, чтобы фиксировать такие случаи. И когда у нас будет настоящий независимый суд, когда в стране на самом деле будут чтить законы, этим людям придется ответить. Ненормально, когда из-за лживых свидетельских показаний сотрудников в форме людей бросают на нары. Вот недавно интеллигентнейший человек, ученый Алексей Пикулик сел за то, что якобы вышел из подъезда и начал орать матом. И сотрудники милиции это подтвердили!

У правозащитных организаций есть списки и судей, которые выносят подобные решения, и лжесвидетелей, и директоров предприятий, и ректоров вузов, увольняющих людей за гражданскую позицию. Придет момент, когда всем им придется ответить. И это не месть! Это справедливость! В Польше и сегодня еще идут суды по подобным преступлениям, которые совершались в 1980-х годах. Это воспитание общества и формирование основ правового государства.

Фальсификация выборов – тоже уголовное преступление, срока давности оно не имеет. И все члены избирательных комиссий, которые участвуют в фальсификации выборов, должны знать, что могут предстать перед судом. И тогда не получится спрятаться за фразу: “Мне приказали!..”

## Супраць рэвалюцыі, але за змены

**– Зямляк ваш тэлефануе з Азёр. Пытанне такое: ці адпавядае назва вашага Руху канкрэтным дзеянням?**

– У нашай арганізацыі цяпер больш за тысячу чалавек. На сёння мы больш грамадская арганізацыя, чым палітычная. Наша галоўная задача – вяртанне Беларусі ў еўрапейскую сям’ю. У абласных гарадах маем сетку “Еўрапейскіх клубаў”. Займаемся праеўрапейскай адукацыяй, у нас ёсць беларускія культурніцкія праграмы, інфармацыйныя, маладзёжныя. Разам з камітэтам “Салідарнасць” дапамагаем студэнтам, якіх выганяюць з універсітэтаў “за палітыку”. Сем’ям тых, хто апынуўся за кратамі за грамадзянскую пазіцыю. Робім усё, каб пра нас больш ведалі ў Еўропе.

Мы супраць крывавых рэвалюцый, але за сур’ёзныя змены ў краіне. Бо многія краіны, якія разам з намі былі ў Савецкім Саюзе, жывуць значна лепш за нас. Напрыклад, тыя ж эстонцы – у СССР у нас з імі быў практычна аднолькавы ўзровень жыцця, а зараз у іх у тры-чатыры разы вышэй! Мы надта спазняемся з рэформамі, але ў гэтым таксама можна знайсці плюс: калі будзем разумнымі, то не паўторым памылак, зробленых у былых сацыялістычных краінах. Але рэформы краіне вельмі патрэбныя і ўжо большасць беларусаў гэта разумее.

## Ішоў, паслізнуўся, зваліўся... гіпс

**– Ірына Тукай з Брэста непакоіць. Распавядзіце, калі ласка, як ваша здароўе?**

**Ці праўда, што за апошні час вам давялося перанесці некалькі аперацый?**

– У красавіку меў вывіх і складаны пералом правага локця.

Працяг на с. 6

# “З дыктатурай у Еўрасаюз не бяруць”

Пачатак на с. 4-5

Зрабілі сур’ёзную аперацыю ў 6-й мінскай клініцы. Дарэчы, і дактары, і медперсанал там проста выдатныя: прафесійныя і вельмі добразычлівыя. Вялікі ім дзякуй! І сёння яшчэ праходжу ў іх рэабілітацыю.

## Як пражыць на пяць мільёнаў?

**– Добры дзень! Мяне завуць Марына, з Мінска званю.**

– Вельмі прыемна!

**– Адкажыце, ці ходзіце вы па крамах? Колькі ў сярэднім грошай пакідаеце за адзін паход? У мяне меней за 200–300 тысяч не атрымліваецца. Вось скажыце: як жыць, калі заробак прыкладна 5 мільёнаў, а усё роўна на нейкія простыя рэчы (не пра брыльянты гаворка!) не хапае?**

– Пастаянна хаджу. Людзі пазнаюць, часта пытаюцца: “Ну, калі вы ўжо?” Ведаю, што беларусы заслужылі лепшае жыццё, бо працавітыя і адукаваныя. Яны цвёрда хочуць перамен. Краіне патрэбна стабільнае развіццё, а не вечная барацьба за “стабільнасць”. Любы эксперт у Бруселі скажа, што калі б сёння выбіраць сярод былых савецкіх рэспублік чарговага прэтэндэнта на далучэнне да Еўрасаюза, то Беларусь была б наперадзе Украіны, Малдовы, Грузіі. Вось толькі з дыктатурай туды не бяруць. Каб жыць паеўрапейску, нам трэба спачатку засвоіць, што адказнасць за заўтра ляжыць на кожным з нас...

## Замест крэсла ва ўрадзе – месца ў турме

**– З Гомеля званю, мяне завуць Ігар Манцэвіч. Скажыце, ці будуць члены Руху “За свабоду” ўдзельнічаць у парламенцкіх выбарах? І што можаце сказаць наконт дыскусіі, якая разгарнулся вакол рашэння прыхільнікаў Мікалая Статкевіча балатавацца ў Палату прадстаўнікоў?**

– Выбары ў Беларусі будуць фарсам, пакуль улады не рэалізуюць простага прынцыпу: лічым галасы разам. Усе дэмакраты абсалютна згодныя: свабодных і справядлівых выбараў няма. А як яны вызначаць свой удзел у кампаніі, гэта іх справа. Я лічу, што для байкоту мы не маем дастаткова ўплыву ў грамадстве і рэсурсаў. Прыхільнікі байкоту з большага правядуць яго віртуальна за камп’ютарам або на канапе. Мы абавязаны паказаць людзям, што дэмакраты не зніклі, што ёсць альтэрнатыва сённяшняму рэжыму. А для гэтага трэба ўдзельнічаць у кампаніі, пажадана з яснымі ўмовамі.

**– Каментуючы спрэчкі пра выбары, вы заўважылі: “Спрэчкі ідуць аб тым, што абсалютна нецікава людзям. Людзі жывуць абсалютна іншым жыццём, нават зацікаўленыя палітычнымі праблемамі”. А што сёння найбольш хвалюе людзей? Эканоміка? Заробкі? Жыллё?**

– Людзей перш за ўсё цікавяць іх сем’і, зарплаты, кошты, перспектывы адукацыі і працы дзяцей. Дарэчы і ў цывілізаваных краінах яны найчасцей заклапочаны тым жа. Іншая справа – у іх ёсць там права выбару ўлады, якая і павінна клапаціцца аб вырашэнні згаданых праблем.

**– І яшчэ пытанне: як думаеце, чаму пасля прэзідэнцкіх выбараў, у якіх вы бралі ўдзел (калі не памыляюся, гэта быў 2006 год), вам не прапанавалі пасаду ва ўрадзе?**

– У нас гэта не ў модзе. Часцей прапануецца месца ў турме. За часы аўтарытарызму там пабывалі дзевяць з 13 зарэгістраваных прэтэндэнтаў на найвышэйшую дзяржаўную пасаду.



**– Вас вітае Ірына Андрэева з Мінска. Мяне цікавіць, калі апошні раз вы сустракаліся з прадстаўнікамі ўлады і абмяркоўвалі рэчаіснасць? Альбо лічыце, што такія сустрэчы непатрэбныя і немагчымыя ў цяперашні час?**

– Я стала сустракаюся з людзьмі з улады. Там шмат годных прафесійных спецыялістаў. Маю шмат асабістых кантактаў, усё ж такі шэсць гадоў працы ў Гродзенскім гарвыканкаме. Гэта і мне вельмі карысна, і ім, думаю, таксама. Шкада, што страх у чыноўнікаў яшчэ большы, чым у простых людзей. Запалоханасць – адна з прычын частковага паралічу лукашэнкаўскай вертыкалі.

## Штрафныя санкцыі

**– Рада вас чуць, Аляксандр Уладзіміравіч! Раскажыце, калі ласка, чым скончылася ваша гісторыя з падатковай інспекцыяй? Калі не памыляюся, у падаткавікоў узніклі пытанні па вашых расходах, і гаворка ішла пра вялікі штраф... Колькі далі?**

– Больш за 6 мільёнаў рублёў...

**– І яшчэ пытанне: як з вамі можна сустрэцца? Дайце, калі ласка, нейкія кантакты, каб можна было звязацца і папярэдне дамовіцца?**

– Няма праблем, запісвайце кантакты Руху “За Свабоду” ў Мінску: тэлефон 280-88-63, мэйл: info@milinkevich.org. Звяртайцеся!

# “Свінцовы” завод: паўкіламетра да лецішчаў

**У Белаазёрску адбыліся грамадскія слуханні паводле справаздачы ацэнкі ўдзеяння завода па вытворчасці свінцу і сплаваў на навакольнае асяроддзе, якую збіраюцца запусціць у горадзе. Слуханні былі скліканыя дзякуючы намаганням каардынатара Руху “За Свабоду” па Брэсцкай вобласці Зміцера Траццяка.**

Слуханні з большага складаліся з выступаў прадстаўнікоў Першай акумулятарнай кампаніі з Пінску, якая мае намер арганізаваць шкоднае прадпрыемства ў Белаазёрску, а таксама ўстановы, якая рыхтавала ацэнку ўздзеяння.

На пытанні грамадскасці адвялі траціну часу слуханняў. Каля дзясятка пытанняў задалі прадстаўнікі Руху “За Свабоду” – намеснік старшыні арганізацыі **Юрась Губарэвіч** і эколаг, кіраўнік мінскай гарадской філіі **Юрась Меляшкевіч**.

На пераважную большасць пытанняў адказы не прагучалі. Напрыклад, аб прычынах скарачэння санітарна-ахоўнай зоны, пра небяспеку вытворчасці свінцу для арганізму чалавека, пра тое, якія аб’екты водазабеспячэння і сяльгасвытворчасці месцяцца ў санітарна-ахоўнай зоне, пра якасць ачышчальных збудаванняў.

Мясцовыя жыхары, што бралі ўдзел у слуханнях, патрабавалі канкрэтных адказаў наконт магчымых праблемаў, а не навуковых дакладаў.

Нейкага галасавання па выніках слуханняў не праводзілася. Бізнэсоўцы і ўлады, як было паведамлена, проста прымуць меркаванне грамадскасці да ўвагі пры прыняцці рашэння.

*“Хаця зразумела, што рашэнне ўжо прынята. Слуханні праводзіліся дзеля выканання фармальнасцяў паводле заканадаўства. Паміж уладамі, стваральнікамі гэтай шкоднай вытворчасці і насельніцтвам – глухая сцяна!Наступным нашым крокам будуць пісьмовыя патрабаванні даць адказы на пытанні, што прагучалі, і*

*Бізнэсоўцы і ўлады, як было паведамлена, проста прымуць меркаванне грамадскасці да ўвагі пры прыняцці рашэння.*

*правесці незалежную экалагічную экспертызу”*, – зазначаў Юрась Губарэвіч.

Юрась Меляшкевіч кажа, што паводле дакладаў на слуханняў ніякіх праблем ад гэтага завода не будзе: *“Ні слова не прагучала пра тую самую шкоднасць свінцу для арганізму чалавека”*. Па яго словах, завод дасць усяго 100 працоўных месцаў 13-тысячнаму гораду, але ж у Белаазёрску і так здаровых толькі 17-20% жыхароў.

Завод у Белаазёрску будзе ўяўляць сабой, паводле афіцыйнай інфармацыі, вытворчасць свінцу і сплаваў для металургічнай перапрацоўкі свінецутрымліваючай сыравіны (лому адпрацаваных акумулятарных батарэй). Аб’ёмы – 10 тысяч тон свінцу і свінцовых сплаваў. Мэта – *“задавальненне патрэбаў беларускіх прадпрыемстваў у свінцы і сплавах, а таксама экспарт прадукцыі ў краіны далёкага і блізкага замежжа; рэалізацыя праектаў пашырэння імпартазамяшчальнай вытворчасці акумулятарных батарэй ў Беларусі; максімальнае ўцягненне адходаў у абарот у якасці другаснай сыравіны, прадухіленне іх шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе”.*

Паведамляецца, што *“завод па вытворчасці свінцу і сплаваў размесціцца ў асобным будынку цэнтральных рамонтных майстэрняў на тэрыторыі Бярозаўскай ГРЭС, у зоне размяшчэння прадпрыемства адсутнічаюць зоны адпачынку насельніцтва і лекавальныя ўстановы, дачныя ўчасткі знаходзяцца на адлегласці 610 м ад тэрыторыі прадпрыемства”.*

Ці не забылі напісаць, што “ўсяго” 610 метраў будзе ад “свінцовага” завода да лецішчаў з бульбай ды трускаўкамі..?



КАЛАЖ АРТУРА ЛАГОДНАГА

# Візавыя палёгкі

**29 чэрвеня ў Бруселі адбылася сустрэча Штэфана Фюле, еўракамісара па пытаннях пашырэння і еўрапейскага суседства, і Аляксандра Мілінкевіча, лідара Руху "За Свабоду". Абмяркоўвалася бягучая сітуацыя ў Беларусі, перспектывы верасьнёўскіх выбараў у парламент і стасункаў Беларусі з Еўрасаюзам, паведамляе афіцыйны сайт Еўрапейскай камісіі.**

Штэфан Фюле адзначыў, што Беларусь займае важнае месца ў парадку дня ЕС, і выказаў заклапочанасць з нагоды існавання ў краіне палітычных зняволеных і жорсткага абыходжання з імі, асудзіў рэпрэсіўныя змены ў заканадаўстве, якія ўзмацняюць паўнамоцтвы КДБ, а таксама пераслед прадстаўнікоў апазіцыі і грамадзянскай супольнасці ў апошні час, у тым ліку журналіста **Андрэя Пачобута**.

Фюле і Мілінкевіч гаварылі пра далейшае супрацоўніцтва паміж ЕС і беларускай грамадзянскай супольнасцю, а таксама апазіцыяй. *"Еўрапейскі дыялог па мадэрнізацыі ўяўляе сабой інавацыйны інструмент для таго, каб абмеркаваць бачанне новай Беларусі і перспектывы падтрымкі з боку ЕС"*, – сказаў Штэфан Фюле.

Еўракамісар запэўніў, што ЕС гатовы ў аднабаковым парадку даць палёгкі ў справе атрымання беларусамі візаў у краіны Еўрасаюза, калі беларускія ўлады праігнаруюць прапанову аб перамовах наконт спрашчэння візавага рэжыму і рэадмісіі.

# Як атрымаць Шэнген больш як на год?

**Беларусы могуць атрымаць шэнгенскую візу на два і болей гадоў у консульстве Літвы.**

Дырэктар консульскага дэпартаменту МЗС Літоўскай Рэспублікі **Андрус Пулокас** пацвердзіў права беларусаў на атрыманне шэнгенскіх візаў на два і болей гадоў.

Міністэрства замежных спраў Літвы паінфармавала кампанію "Без візы!", у якую ўваходзіць і Рух "За Свабоду", што *"і грамадзяне Беларусі, і грамадзяне іншых трэціх дзяржаў маюць права звяртацца ў амбасады і консульскія ўстановы Літоўскай Рэспублікі з заявай на выдачу шэнгенскіх візаў тэрмінам дзеяння да пяці гадоў"*.

Раней 42 беларускія і замежныя арганізацыі звярнуліся да Міністэрства замежных спраў Літвы з просьбай дазволіць беларусам атрымліваць шматразовыя шэнгенскія візы працягласцю да пяці гадоў. Вынікам звароту і далейшай перапіскі з МЗС стаў адказ Андруса Пулокаса, які афіцыйна пацвердзіў права беларусаў на атрыманне ў літоўскіх консульскіх установах шэнгенскіх візаў, тэрмінам дзеяння ў два і болей гадоў.




*"Добра, што цяпер ёсць афіцыйнае пацверджанне ад МЗС Літвы, што візы тэрмінам на 5 гадоў – гэта рэальна*, – кажа прадстаўнік кампаніі "Без візы!" **Вадзім Вілейта**.

*– Будзем спадзявацца, што гэтая практыка будзе пашырацца, і беларусам, якія мусяць часта ездзіць у Літву, не трэба будзе адстойваць чэргі ў амбасаду штогод".*

# Адмаўляюць адзінкам

У 2011 годзе толькі 0,5% беларусаў, ахвочых атрымаць шэнгенскую візу, атрымалі адмову. У Грузіі гэты паказнік складае 14,4%.

Паводле звестак Еўракамісіі, у 2011 годзе 580 тысяч беларусаў атрымалі шэнгенскія візы. У 2010 годзе гэты паказнік складаў 429 тыс. Найбольш візаў выдаюць польскі і літоўскі консульствы – 244 тыс. і 144 тыс. адпаведна. Такім чынам Беларусь стала адным з сусветных лідараў па колькасці атрыманых шэнгенскіх візаў, паведамляе радыё "Свабода".

Практычна ўсе анкеты беларусаў на атрыманне візы задавальняюцца. У апублікаваным на сайце Еўракамісіі дакладзе прыводзіцца статыстыка адмоваў у выдачы візаў для грамадзянаў розных дзяржаваў. Гэты паказнік складае 14,4% для Грузіі, 9,5% для Малдовы, 8,8% для Арменіі, 5,5% для Азербайджану, 3,3% для Украіны.

Газета выдаецца Рухам "За Свабоду". Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 9.07.2012 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by